в ведение духовного ведомства), состоялся позже. По распоряжению губернатора А. П. Беклемишева от 27 октября 1867 г. была создана специальная комиссия, направленная в этот населенный пункт. Ее возглавил губернский архитектор, а в состав вошли: уездный исправник, благочинный, местный священник и несколько крестьян, избранных из числа прихожан. Также при указанной процедуре присутствовал подрядчик. Осмотр здания состоялся в ноябре. Никаких дефектов в техническом плане комиссия не обнаружила, что было зафиксировано в акте[1].

Таким образом, причиной для строительства православного храма в деревне Гурец стало аварийное состояние действующей церкви, выявленное 13 сентября 1859 г. в ходе осмотра церковных зданий по Могилёвской губернии чиновником из Министерства внутренних дел. Бедность прихожан и отсутствие финансовой поддержки правительства не позволили оперативно начать строительные работы. Сооружение объекта велось подрядным способом с 20 сентября 1866 г. ровно год.

**Віктар Хаданёнак** (*Віцебск*)

## ЯЎНЕВІЧ ІПАЛІТ-ДАМІНІК АНТОНАВІЧ: ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ І НАВУКОВАЯ СПАДЧЫНА

Выдатны вучоны-прыродазнаўца і грамадскі дзеяч Уладзімір Іванавіч Вярнадскі справядліва меркаваў, што вывучэнне гісторыі навукі абавязкова павінна быць уключана ва ўніверсітэцкую праграму[2], не кажучы ўжо пра тое, што кожны народ мусіць добра ведаць не толькі сваіх, але і сусветных вучоных. На жаль, да гэтага часу беларусы маюць даволі цьмянае ўяўленне пра сваіх суайчыннікаў, якія шчыравалі на навуковай ніве (асабліва ў галіне натуральных і тэхнічных дысцыплін, медыцыны) і зрабілі шмат значных і карысных адкрыццяў.

Адным з незаслужана «забытых» вучоных-даследчыкаў з’яўляецца Іпаліт-Дамінік Антанавіч Яўневіч. Ён нарадзіўся 4 жніўня 1831 г. у сядзібе Кеміна Сенненскага павета Магілёўскай губерні. Тады быў ва ўсіх сэнсах няпросты і драматычны час. Менавіта ў жніўні 1831 г. канчаткова было падаўлена паўстанне 1830–1831 гг. Звестак аб удзеле сваякоў І. А. Яўневіча ў паўстанні пакуль не знойдзена, нягледзячы на тое, што ён нарадзіўся ў шляхецкай каталіцкай сям’і, а шляхта пераважна прыязна і са спагадай ставілася да паўстанцаў.

[1] НИАБ. Ф. 2001. Оп. 1. Д. 1025. Л. 56–57 об.

[2] Вернадский В. И. Биосфера и ноосфера. М. : Айрис-пресс, 2004. 576 с.

Бацька будучага вучонага Антон Яўневіч меў не дужа шмат зямлі. У 1860 г. Іпаліту-Дамініку па спадчыне перайшло ўсяго 169 дзесяцін (з іх 83 дзесяціны было занята лесам, 60 дзесяцін – ворывам, 13 дзесяцін – сенакосам, 13 дзесяцін – рознай)[1]. Непасрэдна вучоны гаспадаркай не займаўся, таму зямля была аддадзена ім ў доўгатэрміновую арэнду, а затым і ўвогуле прададзена. У 1910 г. фальварак Кеміна (Раснянская воласць, Велікасельскі праваслаўны прыход Сенненскага павета) складаўся ўсяго толькі з 1 двара і 11 душ і належаў ужо праваслаўнаму канцылярскаму служачаму Лянеўскаму[2].

З маладых гадоў Іпаліт-Дамінік Антонавіч меў прагу да ведаў. Вучыўся найперш у Аршанскай павятовай вучэльні і Магілёўскай гімназіі, а затым паступіў у гімназію Санкт-Пецярбурга. Затым была кадэцкая вучэльня. У 1856 г. І. А. Яўневіч паспяхова завяршыў навучанне на фізіка-матэматычным факультэце Імператарскага Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта і атрымаў ступень кандыдата матэматычных навук. Настаўнікамі Іпаліта-Дамініка Антонавіча ў гэтай вядомай на той час установе былі такія славутыя педагогі і вучоныя, як матэматыкі Віктар Якаўлевіч Бунякоўскі, Пафнуцій Львовіч Чабышоў, Восіп Іванавіч Сомаў, фізік Эміль Хрысціянавіч Ленц і інш.

Неўзабаве І. А. Яўневіча прызначылі выкладчыкам тэарэтычнай механікі ў Санкт-Пецярбургскі тэхналагічны інстытут[3]. У 1861 г. Іпаліт-Дамінік Антонавіч быў накіраваны ў працяглую замежную камандзіроўку, што было даволі звыкла для найбольш таленавітых універсітэцкіх выкладчыкаў таго часу. Ён наведаў Германію, Бельгію, Францыю, Англію, дзе пазнаёміўся з упарадкаваннем лепшых машынабудаўнічых заводаў. На працягу шасці месяцаў у Льежы (Бельгія), адным з тагачасных прамысловых і канструктарскіх цэнтраў Еўропы, І. А. Яўневіч займаўся праектаваннем машын пад кіраўніцтвам прафесара Любера.

Пераняўшы каштоўны вопыт, Іпаліт-Дамінік Антонавіч пачаў чытаць у Санкт-Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце курс канструявання машын і адначасова выкладаць прыкладную механіку ў Нікалаеўскай марской акадэміі, дзе ў той жа час працаваў іншы вядомы беларускі вучоны-фізік Аляксандр Іванавіч Садоўскі[4].

---

[1] Опыт описания Могилёвской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях / сост. [с предисл.] и под ред. А. С. Дембовецкого [Электронный ресурс]. Могилёв, 1882–1884. Т. 3. С. 200–201. URL: http://elib.shpl.ru/ru/nodes/17063-opyt-opisaniya-mogilevskoy-gubernii-mogilev-1882-1884 (дата обращения: 18.03.2022).

[2] Список населенных мест Могилёвской губернии [Электронный ресурс] / под ред. Г. П. Пожарова. Могилёвская губерния : Могилёвский губернский статистический комитет, 1910. URL: https://viewer.rusneb.ru/ru/000199_000009_003773481?page=1&rotate=0&theme=white (дата обращения: 18.03.2022).

[3] Мелуа А. И. Инженеры Санкт-Петербурга : энциклопедия. СПб. : Издательство Международного фонда истории науки, 1996. С. 236.

[4] Нікалаеў М. В. Беларускі Пецярбург. Санкт-Пецярбург : Агентство «ВиТ-принт», 2009. С. 42.

У 1868 г. І. А. Яўневіч атрымаў ступень магістра прыкладной механікі і быў зацверджаны на пасадзе прафесара тэхналагічнага інстытута[1]. У гэтым жа годзе ён быў абраны дэканам і займаў гэтую пасаду да 1887 г.

У асабістым жыцці Іпаліта-Дамініка Яўневіча таксама адбыліся станоўчыя змены. Пабраўшыся шлюбам, ён выхоўваў трох сыноў (1863, 1866 і 1874 гадоў нараджэння) і дзвюх дачок (1870 і 1872 гадоў нараджэння)[2]. Адзін з яго сыноў – Мар'ян, стаў міравым суддзёй, атрымаў чын стацкага саветніка і працаваў судовым следчым 1-га ўчастка ў Царскім Сяле.

У пачатку 1870-х гг. І. А. Яўневіч пачаў выкладаць і ў Рускім тэхнічным таварыстве, а ў 1884 г. – за асабістыя заслугі быў унесены ў спіс яго пажыццёвых членаў. З 1886 г. Іпаліт-Дамінік Антонавіч выкладаў прыкладную механіку ў Інстытуце грамадзянскіх інжынераў, а з 1891 г. – у Электратэхнічным інстытуце. У 1890 г. ён атрымаў вельмі прэстыжную для таго часу прэмію інжынернага камітэта[3]. У 1900 г. І. А. Яўневіч быў абраны ганаровым інжынерам-электрыкам Электратэхнічнага інстытута. Па выхадзе на пенсію ён працягваў актыўна чытаць лекцыі і меў вельмі добрае грашовае забеспячэнне – 5000 рублёў (узнагароджанне 1200 руб., пенсія – 3000, дадаткова за чытанне лекцый – 800 руб.)[4].

Іпаліт-Дамінік Антонавіч Яўневіч з'яўляецца шырокавядомым аўтарам не толькі першага вучэбнага дапаможніка па тэорыі пругкасці на рускай мове, але і вялікай колькасці іншых публікацый. Асобныя артыкулы І. А. Яўневіча перакладзены на польскую мову і надрукаваны ў часопісе «Przegląd Techniczny». Актыўная навуковая дзейнасць Іпаліта-Дамініка Антонавіча Яўневіча не засталася без увагі дзяржавы: ён быў узнагароджаны ордэнам святой Ганны I ступені, ордэнам святой Ганны II ступені з імператарскай каронай, ордэнам святога Станіслава I і II ступені, ордэнам святога Уладзіміра III і IV ступені, медалём у гонар царавання Аляксандра III.

Навуковыя даследаванні І. А. Яўневіча былі прысвечаны пытанням супраціўлення матэрыялаў, тэорыі пругкасці, гідраўліцы, прыкладной механіцы, матэматыцы. Ён вызначыў характарыстыкі трываласці многіх будаўнічых матэрыялаў, паставіў і рашыў рад задач па тэорыі пругкасці і дынамікі

[1] Новый энциклопедический словарь / под общ. ред. акад. К. К. Арсеньева. СПб. ; Пг. : Издатели Ф. А. Брокгауз и И. А. Ефрон, 1911–1916. Т. 17 : Душевные болезни – Жуки. [1914]. С. 179.

[2] Список лиц служащих по ведомству Министерства Народного Просвещения на 1903 год [Электронный ресурс]. СПб., 1903. С. 318. URL: http://book-olds.ru BookLibrary/00800-Akademiya-nauk-i-prosveschenie/1903.-Spisok-litsam-sluzhaschim-po-vedomstvu-MNP-na-1903-g.html (дата обращения: 18.03.2022).

[3] Изобретатель : ежемесячный международный научно-практический журнал. 2016. № 7–8. С. 55.

[4] Список лиц служащих по ведомству Министерства Народного Просвещения на 1903 год. С. 318.

паравой машыны. Займаўся даследаваннем асобных пытанняў тэорыі набліжэння функцый. Правёў даследаванні ў галіне механікі вадкасцей. Заклаў асновы набліжанай тэорыі згібу крывалінейнага стрыжня і вывеў формулу прадоўжанага нармальнага напружання бруса вялікай крывізны. Зрабіў важкі унёсак у распрацоўку прынцыпу найменшай работы ўнутраных сіл і разгледзеў яго некаторыя прыватныя выпадкі, у тым ліку для вызначэння статыстыкі магчымых рэакцый апор.

Памёр Іпаліт-Дамінік Антонавіч 5 лістапада 1903 г. ва ўзросце 72 гадоў. Пахавалі яго на Выбаргскіх рыма-каталіцкіх могілках Санкт-Пецярбурга. На вялікі жаль, магіла да нашага часу не захавалася. У 1939 г. могілкі былі цалкам занядбаны і варварскі зруйнаваны. Агароджы і металічныя часткі помнікаў здавалі на металалом, а надмагільныя камяні перамолвалі і прадавалі пад бартавы камень для тратуараў. У гады Вялікай Айчыннай вайны могілкі выкарыстоўвалі для навучання навабранцаў: там кідалі звязкі гранат і «кактэйлі Молатава» у макеты танкаў, а таксама адпрацоўвалі прыёмы штыкавога бою.

Тым не менш беларусы мусяць абавязкова захаваць памяць пра Іпаліта-Дамініка Антонавіча Яўневіча – выдатнага ўраджэнца Сенненскай зямлі, славутага вучонага і педагога, які пакінуў пасля сябе багатую навуковую спадчыну.

**Аляксандр Бараноўскі** (*Мінск*)

## ДА ПЫТАННЯ АБ ДАЦЕ ЗАСНАВАННЯ БАГУШЭЎСКА

Сучасны гарадскі пасёлак Багушэўск узнік дзякуючы будаўніцтву ў 1899–1902 гг. чыгункі Віцебск – Жлобін[1]. Падчас праектавання ўчастка чыгункі Віцебск – Орша было вырашана пабудаваць прамежкавую станцыю. Пры выбары месца для яе будаўніцтва спыніліся на землях, што тэрытарыяльна адносіліся да Серакаратнянскай воласці (цэнтр – сяло Серакаротня, цяпер – вёска Лучазарнае Багушэўскага сельсавета) Аршанскага павета Магілёўскай губерні.

Калі верыць паданню, то зямля пад будаўніцтва станцыі была перадзена мясцовым памешчыкам Дзмітрыем Багушэўскім, які паставіў ўмову, каб станцыю назвалі ў гонар яго жонкі – Багушэўская. Аднак гэта ўсяго толькі прыгожае паданне. Узнікае пытанне, чаму ў назве было выкарыстана яго прозвішча, а не імя або дзявочае прозвішча яго жонкі Марыі (Аўдулінай) Багушэўскай[2].

[1] Барановский А. Богушевск: факты и легенды // Голас Сенненшчыны. 2020. 4 февр. С. 5.

[2] Сборник биографий кавалергардов. [1826–1903] : По случаю столет. юбилея Кавалергардского ея величества государыни имп. Малии Федоровна полка / сост. под ред. С. Панчулидзева. Санкт-Петербург, 1908. Т. 4. С. 151.